


# Emmaus

Бюлетэнь рымска-каталіцкай парафіі

Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі

№ 11-2014, 20.04.2014

PDF–архіў на сайце **www.kasciol.by**


# Allelija! Хрыстос уваскрос!



**Няхай Уваскрослы адорыць Вас мужнасцю, каб змаглі з годнасцю выйсці з складаных сітуацый сучаснага свету!**

**Няхай радаснае “Аллелюя” напаўняе нашыя сэрцы!**



**Нядзеля Уваскрасення Пана**

- На гэтым тыдні расклад багаслужэнняў будзе наступны:
  - у панядзелак - святая Імша ў 10.00
  - у аўторак – святая Імша ў 18.00
  - у сераду – святая Імша ў 18.00
  - у чацвер – святая Імша ў 10.00
  - у пятніцу – святой Імшы ў капліцы не будзе
  - у суботу - святая Імша ў 10.00
  - у нядзелю – святая Імша ў 10.00 і 16.00
- першыя 7дзён пасля Вялікадня – **Актава Пасхі.**
- У наступную нядзелю – **свята Божай Міласэрнасці.**
- Шчырая падзяка для ўсіх, хто дапамог падрыхтаваць капліцу і хто дапамагаў падчас багаслужэнняў Святога Пасхальнага Трыдуума.
- Вялікае дзякуй тым, хто далучыўся да **акцыі збору прадуктаў**, якія мы пасля перададзім сем'ям, якія знаходзяцца ў патрэбе.
- **Просьба аб малітве** за тыя парафіі, якія не застаюцца абыякавымі адносна лёсу нашай супольнасці – Ракаўская парафія, парафія св. Сымона і Алены ў Мінску, парафія св. Яна Евангеліста і св. Максіміліяна ў Мінску, парафія Найсвяцейшай Тройцы ў Друі, а таксама "Карытас" нашай архідыяцэзіі. Таксама заклікаем маліцца ў інтэнцыі вырашэння справы з юрыдычным адрасам нашай парафіі.
- Дзякую Вам, дарагія браты і сёстры, за супольную малітву. Няхай Добры Бог узнагародзіць вашую шчодрасць і дабрыню. Добрага перажывання нядзелі і плённых дзён працы.

тэл: **8-029-880-99-19** (*кс. Андрэй*)

Роздум:

# Традыцыі Вялікадня

Вялікдзень, інакш называем Пасхай або Вялікай нядзеляй, з’яўляецца найважнейшым і самым старажытным хрысціянскім святам. Менавіта ў велікодны час спаўняецца найважнейшая таямніца хрысціянскай веры.

Хрысціянская вера абапіраецца на ўваскрасенні Хрыста, якое з’яўляецца довадам здзейсненага збаўлення. Уваскрасенне Пана як трыумф Хрыста над смерцю — гэта таямніца, якая надае сэнс хрысціянскай веры. Пасля смутку, роздуму, начнога чування ў Вялікую пятніцу настае час шчасця і радасці, бо ўваскрасенне Хрыста — гэта знак Яго перамогі над грахом і смерцю, і шанс на вечнае жыццё.



**Пасхал.** Вялікая свечка, што запальваецца ад агню, які святар благаслаўляе падчас Літургіі святла на пачатку св. Імшы Пасхальнай вігіліі. На гэтай свечцы змяшчаецца выява крыжа, грэцкія літары альфа і амега (пар. Ап 1, 8), лічбы бягучага года, а таксама пяць зерняў ладану (пяць сімвалічных цвікоў) на ўспамін пяці ранаў Хрыста. Пасхал з’яўляецца сімвалам Хрыста і запальваецца падчас урачыстых цэлебрацый на працягу Велікоднага перыяду. У іншы час пасхал захоўваецца ў баптыстэрыі і запальваецца падчас удзялення сакрамэнту хросту, а ад яго запальваюцца свечкі новаахрышчаных.

**Экзультэт** (ад першага слова лацінскага тэксту Exultet iam angelica turba caelorum – Узрадуйцеся ўжо, хоры анёлаў у небе). Абвяшчэнне Пасхі. Старажытны гімн, які спяваецца на пачатку Пасхальнай вігіліі пасля благаслаўлення агню і запальвання пасхалу, у якім праслаўляецца перамога ўваскрослага Хрыста.



**Рэзурэкцыйная працэсія** адбываецца адразу пасля Вігіліі, альбо, паводле мясцовай традыцыі, раніцай у нядзелю перад першай св. Імшой. Гэтая працэсія з’яўляецца ўрачыстым абвяшчэннем уваскрэсення Хрыста.



**Велікоднае ягнё.** Ягнё Новага Запавету - Хрыстус, поўны пакоры і лагоднасці, з'яўляецца сімвалам велікоднага свята.

**Асвячэнне велікодных страваў**



У кожнай сям'і раніцай у Вялікую суботу рыхтуюцца стравы да асвячэння. Хлеб прыпамінае «хлеб жывы, які сышоў з нябёсаў», вяндліны ці велікодны баранак — на ўспамін пасхальнага баранка, а таксама яйка — сімвал новага жыцця, якое нясе ўваскрослы Хрыстус, і соль, якая ахоўвае нас ад сапсаванасці. Велікодны баранак сімвалізуе біблейскага пасхальнага баранка, які быў прадвесцем Баранка-Хрыста, забітага і ўваскрослага, які сваёй крывёй збавіў свет ад вечнай смерці. На велікодны стол таксама пажадана падаць асвечаную соль, хрэн і перац, якія прыпамінаюць біблейскія горкія травы.

**Велікоднае сняданне ў коле сям'і**



Урачысты стол накрываецца белым абрусам з залатой стужкай, на які ставяцца галінкі вярбы, асвечаныя яйкі, прарошчаная пшаніца ці буйміна, барвенак ці самшыт. Зеляніна сімвалізуе новае жыццё, атрыманае падчас святога хросту. У цэнтры стала можа быць змешчаны сямейны пасхал, велікоднае ягнятка і асвечаныя яйкі, хлеб і соль (т. зв. свянцонка). Таксама можна загадзя падрыхтаваць асвечаную ваду і крапідла.

У велікодны панядзелак з раніцы пад вокнамі пачыналі спяваць валачобнікі (найперш песню «Вясёлы дзень для нас настаў»), атрымліваючы ва ўзнагароду за гэта рэшткі святочных страваў, а часам і невялікія грошы.

Самая любімая гульня на Вялікдзень — біткі. Стукаліся святочнымі яйкамі, і пераможцам аказваўся той, у каго яно заставалася цэлае («мацак»). Некаторыя шчасліўцы выйгравалі ажно поўную шапку чырвоных яек. Знаходзіліся і жартаўнікі, якія замест яек падстаўлялі пафарбаваны камень круглай формы і такім вясёлым падманам здабывалі перамогу.

2014 © **Рымска-каталіцкая парафія Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі**